View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE

УДК 94 (476):[377.1:63]-053.81

# СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧАЯ ПАДРЫХТОЎКА МОЛАДЗІ ПАЛЕСКАГА ВАЯВОДСТВА Ў МІЖВАЕННЫ ПЕРЫЯД

***Віталій Крывуць***
*Баранавічы, Беларусь*

Артыкул прысвечаны развіццю прафесійнай падрыхтоўкі сельскай моладзі на тэрыторыі Палескага ваяводства ў 1920 – 1930-х гг. На аснове дакументальных матэрыялаў аналізуюцца асноўныя формы рэалізацыі гэтага накірунку афіцыйнай маладзёжнай палітыкі, іх дасягненні і недахопы.

***Ключавыя словы: Заходняя Беларусь, Палескае ваяводства, моладзь, прафесійная падрыхтоўка***

Полесгу

Дзяржаўная маладзёжная палітыка заўсёды мае сваёй мэтай падрыхтаваць моладзь да актыўнага ўдзелу ў сацыяльна-эканамічным жыцці грамадства. У сувязі з гэтым адным з важнейшых накірункаў дадзенай палітыкі з'яўляецца прафесійная падрыхтоўка маладога пакалення. Гэта ў поўнай меры адносілася і да мерапрыемстваў польскіх ўлад у маладзёжным асяроддзі на тэрыторыі заходнебеларускага Палесся, якое ў міжваенны перыяд знаходзілася ў складзе польскай дзяржавы, II Рэчы Паспалітай (II РП), у якасці Палескага ваяводства. Вывучэнне гэтай праблематыкі, якая не знайшла належнага адлюстравання ў айчыннай гістарыяграфіі, дае не толькі магчымасць скласці больш аб'ектыўную карціну грамадска-палітычнага жыцця Заходняй Беларусі, але і дазваляе прааналізаваць канкрэтны прыклад рэалізацыі дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі.

Створанае ў 1921 г. Палескае ваяводства, як і ўся Заходняя Беларусь, з'яўлялася аграрным рэгіёнам міжваеннай польскай дзяржавы. Згодна з афіцыйнымі дадзенымі, у 1921 г. у сельскай гаспадарцы было занята 81,9% насельніцтва ваяводства. Праз дзесяць год, у 1931 г., гэты паказчык амаль не змяніўся і складаў 81,3% [1, с. 238]. Адначасова значную частку насельніцтва складала моладзь ва ўзросце ад 15 да 24 гадоў. Як сведчыў афіцыйны перапіс насельніцтва 1931 г., у 8 заходнебеларускіх паветах ваяводства (Брэсцкім, Драгічынскім, Кобрынскім, Косаўскім, Лунінецкім, Пінскім, Пружанскім і Столінскім) пражываў 1 036 951 чалавек, з іх 198 893 ці больш за 19% адносілася да маладога пакалення [2, С. 40–43]. Зразумела, што асноўная частка моладзі, улічваючы асаблівасці гаспадарчага развіцця рэгіёна, павінна была працаваць у аграрным сектары.

Неабходна адзначыць, што ўзровень развіцця аграрнага сектара Заходняй Беларусі быў даволі нізкім у параўнанні з іншымі рэгіёнамі II РП, якая ў гэтым плане не адносілася да перадавых краін Еўропы. Напрыклад, сярэдняя ўраджайнасць збожжавых культур у Польшчы ў 1926–1930 гг. складала 10 цэнтнераў з гектара, у той час як у Бельгіі – 23,4 цэнтнера, у Чэхаславакіі – 16,2 цэнтнера, у Германіі – 16 цэнтнераў [3, с. 180]. У заходнебеларускіх ваяводствах, у тым ліку і Палескім, ураджайнасць была звычайна ніжэй, чым у сярэднім па краіне [1, с. 248].

Адной з прычын такога становішча польскія ўлады лічылі нізкі ўзровень культуры сельскагаспадарчай вытворчасці, слабае распаўсюджанне агратэхнічных ведаў і адсутнасць адпаведнай прафесійнай падрыхтоўкі сярод вясковага насельніцтва.

Спробы змяніць сітуацыю ў аграрным сектары рабіліся з самага пачатку існавання II РП. У ліпені 1920 г. быў прыняты "Закон аб народных сельскагаспадарчых школах". Гэтыя школы павінны былі весці "прафесійную падрыхтоўку самастойных сельскіх гаспадароў і гаспадынь, а таксама грамадзян краіны, якія разумеюць свае абавязкі" [4, с. 237].

Згодна з законам, планавалася стварыць на працягу 20 гадоў у кожным павеце па 2 сельскагаспадарчыя школы, мужчынскую і жаночую. Дзяржава выдзяляла на гэтыя мэты неабходныя зямельныя надзелы, а таксама фінансавыя сродкі на будаўніцтва і арганізацыю школ, на зарплату настаўнікаў. Курс навучання працягваўся 11 месяцаў. У школы прымаліся юнакі з 16 гадоў і дзяўчаты з 14 гадоў. Усе кандыдаты павінны былі мець пасведчанне аб заканчэнні ўсеагульнай школы. У час навучання вучні пражывалі ў платным школьным інтэрнаце [4, С. 237–238]. Дзеянне "Закона аб народных сельскагаспадарчых школах" распаўсюдзілася на тэрыторыю Палескага і Навагрудскага ваяводстваў летам 1921 г. [5, с. 1150].

Аднак, як паказала практыка, народныя сельскагаспадарчыя школы не змаглі кардынальна змяніць сітуацыю ў аграрным сектары. На гэта паўплываў шэраг прычын. Напрыклад, праграма навучання была вельмі перагружанай. Яна складалася з агульнаадукацыйных прадметаў (польская мова, матэматыка, геаграфія, навука аб сучаснай Польшчы, гісторыя Польшчы, фізіка, хімія, метэаралогія) і спецыялізаваных (земляробства, жывёлагадоўля, агародніцтва, пчалярства, садаводства, сельскае будаўніцтва, рацыянальная арганізацыя сельская гаспадаркі). Акрамя таго, праводзіліся практычныя заняткі. Таксама прадугледжвалася знаёмства с працай узорных гаспадарак,

кааператываў, кас узаемадапамогі і г.д. [6, С. 9–10]. Фактычна, прайсці ўсю прадугледжаную праграму было вельмі цяжка, асабліва калі ўлічваць нізкі ўзровень агульнай адукацыі большасці вучняў.

Але галоўнай перашкодай для развіцця сістэмы народных сельскагаспадарчых школ сталі фінансавыя цяжкасці. У сувязі з імі ў Палескім ваяводстве к 1928 г. было створана толькі тры школы: мужчынскія ў Колпіне (Брэсцкі павет) і Дубоі (Пінскі павет) і жаночая ў Планце (Кобрынскі павет) [7, с. 6]. К сярэдзіне 1930-х гг. іх колькасць дасягнула шасці [8, с. 10]. Гэтага было недастаткова, каб забяспечыць маштабную прафесійную падрыхтоўку вясковай моладзі Палескага ваяводства. Пры гэтым наведвальнасць школ была невысокай. Афіцыйная прэса адзначала, што “там, дзе магло б быць 50 хлопцаў, ёсць толькі 15” [9, с. 4]. Прычынай такога становішча было тое, што большасць сялян не мелі магчымасці плаціць за утрыманне сваіх дзяцей у інтэрнаце, а таксама не жадалі страчваць амаль на год пару рабочых рук.

У сувязі з фактычным правалам развіцця сістэмы народных сельскагаспадарчых школ пачаліся спробы арганізацыі розных форм пазашкольнай аграрна-асветніцкай працы. Узнікла ідэя разгарнуць на базе маладзёжных арганізацый планавую і сістэматычную акцыю ў выглядзе сельскагаспадарчых конкурсаў. Першы праект такой акцыі быў прапанаваны ў 1925 г. Цэнтральным саюзам сельскай моладзі (ЦССМ). У 1926 г. сельскагаспадарчыя конкурсы прайшлі ў некалькіх паветах ІІ РП. Міністэрства сельскай гаспадаркі пазітыўна ацаніла дадзенае мерапрыемства і пачало аказваць яму сур’ёзную фінансавую дапамогу. Так, у 1927 г. аб’ём фінансавання з боку міністэрства складаў 10 000 злотых, у 1929 г. гэтая сума дасягнула 1 000 000 злотых [10, с. 146]. Кіраўніком працы па прафесійнаму навучанню вясковай моладзі з’яўляўся прафесар Ю. Мікулоўскі-Паморскі, які ўвёў тэрмін “Сельскагаспадарчая падрыхтоўка” (СП) у адносінах да конкурснай акцыі і лічыў яе “нязмерна каштоўным спосабам падрыхтоўкі вясковай моладзі да прафесіі” [11, с. 423].

Звычайна адзін калектыў СП ствараўся пры аддзяленні маладзёжнай арганізацыі і аб’ядноўваў да 15 удзельнікаў. Калектыў абіраў тэматыку працы ў галіне земляробства ці жывёлагадоўлі. Прафесійную дапамогу калектывам аказвалі інструктары сельскагаспадарчых арганізацый. Адначасова канкурсанты павінны былі весці справаздачнасць, а таксама займацца самаадукацыяй. У верасні ці кастрычніку арганізоўваліся павятовыя ці рэгіянальныя выставы калектываў СП, на якіх падводзіліся вынікі працы. Пераможцы атрымлівалі ўзнагароды, звычайна гэта быў сельскагаспадарчы інвентар, спецыялізаваныя бібліятэчкі ці стыпендыі для навучання ў народных сельскагаспадарчых школах. Праца ў СП была разлічана на 3 гады ці 3 ступені. На першай ступені калектыў займаўся земляробчай тэматыкай, на другой – жывёлагадоўчай, на трэцяй – усёй гаспадаркай. Лічылася, што 3 ступені СП забяспечваюць усебаковую прафесійную падрыхтоўку да працы ў аграрным сектары [12, С. 21–25]. На думку ініцыятараў СП на тэрыторыі Палескага ваяводства “сельскагаспадарчыя конкурсы павінны стаць сельскагаспадарчым і грамадзянскім выхаваннем моладзі. Праз сельскагаспадарчыя конкурсы канкурсант павінен у першую чаргу выхоўваць сябе, фарміраваць сваю волю і прыроджаны розум, заахвочваць розум да хуткага дзелавога мыслення” [13, С. 33–34].

На тэрыторыі Палескага ваяводства акцыю СП разгарнуў мясцовы праўрадавы Палескі саюз сельскай моладзі (ваяводскі філіял ЦССМ) у 1928 г. Спачатку акцыя ахапіла тры паветы – Брэсцкі, Пінскі і Сарненскі. У ёй удзельнічалі 27 гурткоў Палескага ССМ. Конкурсная тэматыка была даволі разнастайнай: гадоўля парасят, цялят, курэй, вырошчванне бульбы, кармавых буракоў, кукурузы, кветак [14, с. 9]. Згодна з афіцыйнай статыстыкай, усяго ў 1928 г. на тэрыторыі ваяводства было створана 100 калектываў СП (520 удзельнікаў). З іх конкурсную працу паспяхова завяршылі 74 калектывы (370 удзельнікаў) [15, с. 111].

У далейшым акцыя СП на тэрыторыі Палескага ваяводства развівалася даволі паспяхова, паступова набываючы размах. У 1929 г. яна ахапіла 4 паветы: конкурсную

ПолесГУ

працу завяршылі 101 калектыў СП (590 удзельнікаў). У наступным 1930 г. калектывы СП існавалі ўжо ва ўсіх паветах Палескага ваяводства. На той момант тут іх было 289 (2 028 удзельнікаў) [16, с. 14]. З іх 241 калектыў (1 326 удзельнікаў) быў створаны пры Палескім саюзе сельскай моладзі [15, с. 111]. Акрамя яго ў акцыі СП удзельнічалі члены Стралецкага саюза, каталіцкага Саюза польскай моладзі, а таксама “неарганізаваная” моладзь.

Пэўны спад колькасці калектываў і ўдзельнікаў СП назіраўся ў 1931–1932 гг., што было выклікана наступствамі эканамічнага крызісу. Як адзначалася ў справаздачы Палескага ваяводскага ССМ, “агульны крызіс у краіне адбіўся і на конкурснай працы сярод моладзі. Члены гурткоў неахвотна ставяцца да працы, тлумачаць сваё нежаданне тым, што павышэнне ўраджайнасці і фінансавыя выдаткі немэтазгодны, паколькі немагчыма збыць вырабленыя зараз прадукты, і тым болей іх будзе немагчыма збыць, калі вытворчасць павялічыцца” [13, с. 16].

Але кіраўніцтва саюза здолела пераадолець гэтыя настроі членаў сваёй арганізацыі. Таму потым, да самага канца 1930-х гг. працягваўся рост акцыі СП. Неабходна адзначыць, што акрамя непасрэдна конкурснай працы на тэрыторыі ваяводства ў рамах СП вялася і значная асветніцкая дзейнасць, у першую чаргу ў выглядзе розных курсаў. Так, напрыклад, зімою 1932–1933 гг. на тэрыторыі ўсіх паветаў Палескага ваяводства былі праедзены курсы для “перадавікоў” СП. Яны ахапілі 275 чалавек з 115 гурткоў. Агульны кошт гэтых мерапрыемстваў склаў 2 015 злотых [17, с. 40]. Гэта станоўча ўплывала на развіццё конкурснай акцыі.

Аднак неабходна прызнаць, што ў агульнадзяржаўным маштабе развіццё акцыі СП у Палескім ваяводстве выглядала даволі сціпла. Але, калі казаць пра Заходнюю Беларусь, то тут палескія канкурсанты дасягнулі пэўных поспехаў. Так, у 1933 г. адным з лідараў у правядзенні сельскагаспадарчай падрыхтоўкі было Віленскае ваяводства – тут дзейнічала 569 калектываў (4 008 удзельнікаў). Яго абганялі толькі Варшаўскае – 637 калектываў (4 195 удзельнікаў) і Кракаўскае ваяводства – 615 калектываў (4 444 удзельніка). Палескае ваяводства займала 12-е месца (219 калектываў і 1 351 удзельнік). Навагрудскае ваяводства знаходзілася на 14-м месцы (109 калектываў і 759 удзельнікаў). Усяго на той час акцыя СП праходзіла ў 16 ваяводствах [18, с. 6].

У 1938 г., згодна з дадзенымі агульнадзяржаўнай статыстыкі, Палескае ваяводства ў акцыі СП занімала 11-е месца (513 калектываў і 2 861 удзельнік), Віленскае ваяводства – 12-е месца (413 калектываў і 2 685 удзельнікаў), Навагрудскае ваяводства – перадапошняе 15 месца (390 калектываў і 1 938 удзельнікаў) [19, с. 339]. Праявай поспехаў акцыі СП на тэрыторыі заходнебеларускага Палесся было не толькі яе колькаснае развіццё. Мясцовыя конкурсныя калектывы ў пэўнай ступені садзейнічалі распаўсюджванню больш перадавых спосабаў гаспадарання, увядзенню новых сартоў сельскагаспадарчых культур. Напрыклад, адным з дасягненняў СП у Палескім ваяводстве стала распаўсюджванне кармавых буракоў, якія раней былі амаль невядомымі ў рэгіёне [15, с. 113].

Такім чынам, прафесійная, а менавіта сельскагаспадарчая падрыхтоўка моладзі з’яўлялася важнай часткай дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі на тэрыторыі Палескага ваяводства ў міжваенны перыяд. Спачатку польскія ўлады імкнуліся рэалізоўваць яе праз сістэму народных сельскагаспадарчых школ. Аднак у сувязі са значнымі матэрыяльнымі цяжкасцямі стварыць паўнавартасную сістэму прафесійнай адукацыі на тэрыторыі ваяводства не ўдалося. Таму з канца 1920-х гг. значная ўвага надавалася пазашкольным формам агратэхнічнай асветы, у першую чаргу конкурснай акцыі СП. На тэрыторыі Палескага ваяводства яна набыла значны размах і дасягнула пэўных поспехаў. К канцу 1930-х гг. палескія канкурсанты з’яўляліся лідарамі сярод прадстаўнікоў іншых заходнебеларускіх ваяводстваў II РП. Але трэба прызнаць, што СП усё ж такі не здолела ахапіць асноўную масу палескай вясковай моладзі і не магла кардынальна паўплываць на стан аграрнага сектара рэгіёна, які патрабаваў не толькі развіцця сельскагаспадарчай асветы.

1. Рижский мир в судьбе белорусского народа. 1921 – 1953 гг. В 2 кн. / Нац. акад. наук Беларуси, Ин-т истории; редкол.: А.А. Коваленя [и др.]. – Минск : Беларуская навука, 2014. – Кн. 1. – 593 с.
2. Drugi powszechny spis ludności z dn. 9.XII. 1931 r. Mieszkania i gospodarstwa domowe. Ludność. Stosunki zawodowe. Województwo Poleskie. – Warszawa : Nakładem Głównego Urzędu Statystycznego, 1938. – 282 s.
3. Wieczorek, T. Historia szkolnictwa rolniczego w Polsce / T. Wieczorek. – Warszawa: Skrypty szkoły głownej gospodarstwa wiejskiego Akademii Rolniczej w Warszawe, 1980. – 288 s.
4. Ustawa z dnia 9 lipca 1920 r. o ludowych szkółach rolniczych // Dziennik Urzędowy Ministerstwa Wyznań Religijnych i Oświecenia Publicznego. – 1920. – № 20. – S. 237 – 240.
5. Rozporadzenie Rady Ministrów z dnia 19 lipca 1921 r. w przedmiocie rozciągnięcia na województwa: nowogródzkie, poleskie i wołyńskie i powiaty grodzieński, wołkowyski i białowejski województwa białostockiego mocy ustawy o ludowych szkołach rolniczych // Dziennik Ustaw Rzeczypospolitej Polskiej. – 1921. – № 66. – S. 1155.
6. Spława-Neyman, H. Czego uczą szkoły rolnicze / H. Spława-Neyman // Polesie. – 1928. – № 19. – S. 9 – 10.
7. Do Szkół Rolniczych // Polesie. – 1928. – № 7. – S. 6.
8. Rühle, E. Ziemie Wschodnie w cyfrach i kartogramach / E. Rühle // Rocznik Ziem Wschodnich, 1938. – Warszawa : Wydawnictwo Zarządu Głownego Towarzystwa rozwoju Ziem Wschodnich, 1938. – S. 5 – 21.
9. Oświata rolnicza // Polesie. – 1928. – № 2. – S. 4.
10. Kobyliński, Z. Oświata rolnicza na wsi w Polsce / Z. Kobyliński // Polska oświata pozaszkolna. – 1930. – № 3. – S. 143 – 146.
11. Mikułowski-Pomorski, J. Przysposobienie rolnicze drogą konkursów / J. Mikułowski-Pomorski // Tygodnik Rolniczy. – 1928. – № 41 – 42. – S. 421 – 424.
12. Ciemniewski, J. Praca zespołu w Przysposobieniu Rolniczem / J. Ciemniewski. – Warszawa : Centralny Komitet do spraw młodzieży wiejskiej, 1934. – 112 s.
13. Sprawozdanie Poleskiego Wojewodzkiego Związku Młodzieży Wiejskiej za rok 1929. – Brześć nad Bugiem: [s.n.], 1930. – 62 s.
14. Konkursy rolnicze w Kołach Młodzieży Wiejskiej na terenie Województwa Poleskiego // Polesie. – 1928. – № 5. – S. 9.
15. X-lecie Związku Młodej Wsi Województwa Poleskiego 1928 – 1938. – Brześć nad Bugiem : Drukarnia Literacka, 1938. – 127 s.
16. Korwin-Milewski, M. Przysposobienie Rolnicze / M. Korwin-Milewski // Ziemia Poleska. – 1932. – № 1. – S. 14.
17. Sprawozdanie P.W.T.O. i K.R. za rok 1932/33 // Ziemia Poleska. – 1933. – № 4 – 5. – S. 7–48.
18. O nowych uczni (konkursistów) P. R. // Rolnik Nowogródzki. – 1934. – № 7. – S. 6.
19. Mały Rocznik Statystyczny 1939. – Warszawa : Główny Urząd Statystyczny, 1939. – 460 s.

ПолесГУ